# Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ



*Ганна Іосіфаўна Скаржынская-Савіцкая, дзіцячая пісьменніца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, нарадзілася 3 жніўня 1966 г. у вёсцы Куцы Лес Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў мнагадзетнай сям'і.*
*У 1981 годзе закончыла Таневіцкую васьмігадовую школу. У 1985 годзе – Гродзенскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум. Пасля заканчэння працавала на Гродзенскім заводзе аўтаагрэгатаў.*

*Друкавалася ў часопісах "Вясёлка", "Рукзачок", "Пралеска", "Детские сказки", у газетах "Гродзенская праўда", "Перспектыва", "Вячэрні Гродна", "Настаўніцкай газеце", "Дзянніца", у калектыўных зборніках "Пакліч у госці сонца" і "Вясёлка". Казкі і апавяданні гучалі ў перадачы "Вячэрняя казка" на беларускім рэспубліканскім радыё.*
*Выдала кнігі для дзяцей "Вечарынка" (Гродна, 2008г.), "Расінка і Сонечны зайчык" (Гродна, 2010г.), "Приключения хомячка Тошки" (Гродна, 2010г.). У выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі" вышлі кнігі "Прыгоды хамячка Тошкі" (2013г.) і "Казкі-чамучкі" (2013г.) Жыве ў Гродна, працуе ў Таварыстве з абмежаванай адказнасцю "З-СБ".*

*Самым каштоўным у жыцці лічыць тое, што засягнута ўласнай працай, уласнымі намаганнямі.*

**АПАВЯДАННІ І КАЗКІ**

**З КНІГІ**

**ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ**

# КВЕТКА МАЛОЙ РАДЗІМЫ



*Кнігу* ***“Кветка малой радзімы”*** *я прысвяціла мясцінам, з якімі б было звязана маё дзяцінства і школьныя гады. Куды і цяпер наведваюся з задавальненнем, каб абняць маму і тату, адпачыць ад гарадской мытусні, прайсціся сцежкамі далёкага дзяцінства,*

*адчуць сябе часцінкай самага дарагога і шчымлівага – малой радзімы, роднай Бацькаўшчыны.*

## КАСЦЁЛ УШЭСЦЯ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ДЗЕВЫ МАРЫІ

Караліна, Мацей, мама і тата ехалі да бабулі ў вёску. Праязджаючы праз вёску Новы Двор, каля старажытнага загадкавага касцёла, які ўзвышаўся за каменнай агароджай, дзесяцігадовая дзяўчынка спытала:

–Мама, калі ты мне раскажаш пра касцёл?

– Заўтра абавязкова раскажу, – паабяцала мама, – толькі пойдзем раней, каб да службы я змагла табе ўсё расказаць і паказаць.

– Ура! Я згодна! – узрадавалася Каралінка.

– Можна, і я з вамі? – спытаў Мацей, – мне таксама цікава ведаць пра бабулін касцёл.

– Ты яшчэ малы! – засмяялася Караліна.

– Які гэта я малы! – запярэчыў брацік. – Мне ўжо сем гадоў! Я ўжо ў школу пайду!

– Ну, добра, пойдзем разам! Я пажартавала! – пагадзілася сястрычка.



У нядзелю раніцай, святочна апранутыя мама, Каралінка і Мацей ішлі ў касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Па дарозе мама расказвала дзецям, як у дзяцінстве яна хадзіла ў гэты касцёл з бабуляй Казімірай і сваёй мамай. Асабліва падабалася бываць на святы. На Божае Нараджэнне дзяліліся аплаткам, на Новы год пахла ялінкамі, якія міргацелі рознакаляровымі агеньчыкамі, на Вялікдзень асвячалі яйкі, на Сёмуху алтары ўпрыгожвалі бярозкамі, і ў храме стаяў свежы водар маладых, клейкіх бярозавых лісточкаў. А на парафіяльнае свята – Узнясенне Дзевы Марыі,

якое святкуецца 15 жніўня – у Новым Двары было незвычайна святочна. Сюды з’язджаліся ксяндзы з многіх іншых касцёлаў. Ішла працэсія, людзі спявалі святыя песні, ухваляючы Бога і Божую Маці. На такія святы каля касцёла прадаваліся розныя прысмакі: каляровае пячэнне, яркія кручаныя цукеркі, пеўнікі на палачках, а таксама абразы і іншыя рэлігійна-абрадавыя рэчы.

– Я да гэтага часу памятаю смак і водар тых ласункаў, а колькі душэўнай цеплыні захоўваюць такія ўспаміны з дзяцінства, – задумліва сказала мама. – А касцёл наш пабудаваны вельмі даўно, у 1749 годзе, на месцы храма 1670 года. За гэты час выраслі тры пакаленні. У касцёл прыходзілі маліцца вашы прабабулі, бабулі, я са сваімі равеснікамі і вы – ужо чацвёртае пакаленне. Цікава тое, што касцёл драўляны. І не пашкодзілі яго ні навальніцы, ні завеі, ні вятры. Напэўна, прасякнуты ён божым словам, таму і трымаецца моцна. Таксама драўляная і званіца. Вунь, бачыце, чатырохвугольная пабудова каля брамы? Яна пабудавана ў 1852 годзе. У гэтым годзе званіцы спаўняецца 160 год. Па вялікіх святах звон разліваецца па ўсёй акрузе – кліча людзей на набажэнства. З даўніх часоў людзі верылі, што касцельны звон адпужвае хваробы і выганяе злых духаў з мясцовасці.

– Вось як цікава! – пазіраючы васількОвымі вачыма, дзівілася Каралінка.

– Касцёл – архітэктурны помнік, – працягвала мама, – пабудаваны прамавугольнай формай. Галоўны фасад завершаны васьмігранай вежай з крыжам.

– А прыбудовы з двух бакоў – гэта сакрысціі. Я ведаю, таму што нас бабуля выводзіць туды, калі ў касцёле горача, – дадаў Мацей.

– Так, гэта ў левую сакрысцію можна выходзіць, – усміхнулася мама, – а правая – памяшканне для ксяндза. Там ён апранае арнат*, там знаходзяцца яго святыя кнігі і ўсе неабходныя для службы рэчы.

– А цяпер пойдзем у касцёл, – сказала мама і ўзяла за рукі дзяцей.



Яна павяла іх не праз бакавы ўваход, а праз асноўны – для таго, каб дзеці ўбачылі веліч, святло і непаўторную прыгажосць касцёла. Малітоўная зала выглядала, як заўсёды, святочна. Скрозь аконную мазаіку, выкананую ў выглядзе крыжа каляровымі шкельцамі, свяціла сонца. Вецер злёгку калыхаў за вокнамі дрэвы, якія рассякалі сонечныя прамяні, і па сценах святыні скакалі вясёлкавыя зайчыкі.

Людзей было няшмат.

– У касцёле тры алтары, – ідучы наперад, шаптала мама, – усе яны выкананыя ў стылі ракако*. Цокаль* асноўнага алтара ўпрыгожаны пазалочанымі медальёнамі. У цэнтры размешчаны абраз “Узнясення Святой Дзевы Марыі”. Бачыце, як анёлы ўзносяць Божую Маці ў неба? А па баках скульптуры Святых Пятра і Паўла.

Дзеці з захапленнем пазіралі на абраз і прыслухоўваліся да кожнага матчынага слова.



– Верх алтара аддзелены ад асноўнага яруса крапаваным карнізам, упрыгожаны выявамі галовак херувімаў*, кароны і ваз. А пасярэдзіне абраз “Каранаванне Маці Божай”. Усё ўпрыгожана пазалочанай разьбой па дрэве, узорамі, арнаментамі, лісцікамі?

– Прыгожа, мне вельмі падабаецца, – прашаптала Каралінка.

– Хадзем, я раскажу вам яшчэ пра бакавыя алтары, – сказала маці.

Яны падышлі да левага алтара. З вялікага абраза на дзяцей пільна пазірала Маці Божая, якая трымала на руках свайго Святога Сына.

– Гэта абраз “Маці Божай Нястомнай Дапамогі”, – сказала мама.



Людзі моляцца да яе, каб дапамагла ў розных жыццёвых выпадках.

Каралінцы здавалася, што Маці Божая сочыць за кожным іх крокам, кожным рухам, але не дзеля дакору, а для таго, каб падтрымаць, падказаць і дапамагчы. І дзяўчынка ўсміхнулася ёй.

Мама ўзяла дзяцей за рукі і моўчкі павяла на другі бок.



– А гэта алтар Крыжавання Ісуса Хрыста. Сын Божы пакутаваў за нашыя грахі і памёр на крыжы, – сказала яна.

Дзеці моўчкі ўглядаліся ў кожную рысачку абраза. На алтарах стаялі букеты кветак. І па касцёле плыў непаўторны мядовы водар півоняў, салодкі лясны пах рамонкаў, чырвоных макаў і стакроткі.

– Мама, чаму такі пах бывае толькі ў касцёлах? – спытала Каралінка.

– Таму што водар кветак змешваецца з пахам запаленых свечак, – адказала мама. – А цяпер азірніцеся назад.

Перад дзецьмі велічна ўздымаўся арган, дэкарыраваны двума драўлянымі скульптурамі анёлаў, двума херувімамі і накладной пазалочанай разьбой па дрэве ў стылі ракако.



–Гэта такі вялікі музычны інструмент?! – здзівілася Караліна.

–Так, гэта арган, – адказала мама, – арганная музыка цудоўная, велічная, непараўнальная… Пойдзем на хоры.

Па драўляных сходках маці з дзецьмі падняліся на хоры.

Ля аргана сядзела маладая дзяўчына-арганістка і гартала касцельны спеўнік. Яна рыхтавалася да імшы. Дзяўчына зірнула на дзяцей і ўсміхнулася.

– Можна, мы тут пабудзем? – папрасіля яе Караліна.

– Можна, – коратка адказала арганістка.

З высокіх хораў дзеці назіралі, як збіраюцца людзі на службу. Бабулькі ў рознакаляровых квяцістых хусцінках з вышыні нагадвалі суцэльны яркі дыван, які рассцілаўся на ўвесь храм.

Меладычна зайграў арган, і арганістка пачала спяваць песню-ўхваленне Маці Божай. Яе падхапілі прыхажане. Такой чаруючай арганнай музыкі дзеці яшчэ ніколі не чулі! Дзяўчына спявала прыгожым аксамітным голасам, і Каралінцы здавалася, што ёй падспеўваюць тоненькімі галасамі анёлы і херувімы, якія ўпрыгожвалі арган. А мноства нябачных анёлаў кружаць над касцельнай залай і падыгрываюць на залатых флейтах. Дзяўчынка з захапленнем глядзела на галоўны алтар – на Маці Божую. Яна адчувала сябе ў іншым свеце, а душа яе напаўнялася незразумелым дагэтуль пачуццём нечага светлага, чыстага, цёплага, пяшчотнага, узнёслага… Душа яе напаўнялася верай у Бога.

Выйшаў святар, і пачалася імша.

…Пасля службы Караліна, Мацей і мама выйшлі з касцёла. Яркае сонца паднялося над густымі верхавінамі дрэў. Дзень быў незвычайны, святочны, і настрой у дзяцей быў узнёслы.

– Мама, а там таксама касцёл? – спытаў Мацей, паказваючы на пабудову, якая знаходзілася на прыгорку могілак.



– Не, гэта капліца святога Георгія (Юрыя), – адказала мама, – там спраўляюцца службы падчас пахавання і на Задушны дзень, калі памінаюць усіх памерлых. Гэта таксама помнік народнага драўлянага дойлідства. Капліца пабудавана ў 1882 годзе.

– На капліцы таксама дзве вежы, – адзначыла Караліна.

– Вялікая вежа з высокім шатром і крыжам – гэта чацверыковая званіца, пачала расказваць мама, – капліца таксама, як касцёл і званіца, пабудавана прамавугольным зрубам пад двухсхільным гонтавым дахам* з вальмай* над алтарнай часткай, якая завершана шатровай слупавай сігнатуркай (замацаваннем).

– Цікава, – задумліва сказаў Мацей.

– Так, усё, што звязана з гісторыяй цікава, – пагадзілася мама, – мы павінны ведаць гісторыю сваёй радзімы, свайго роднага краю. Я расказала вам пра нашу спадчыну, а вы будзеце расказваць сваім дзецям.

*арнат – адзенне святара
*ракако – стыль у мастацтве і архітэктуры
*цоклаль – фундамент будынка, які знаходзіцца над зямлёй
*херувім – анёл
*гонтавы дах – драўляная страха з невялікіх дошчачак
*вальма – скат шатровай страхі трохвугольнай формы

## ПОМНІК

Ігнат прачнуўся рана. Скрозь аконныя занавескі прабіваліся першыя майскія сонечныя прамяні. Хлопчык успомніў, што сёння 9 мая – Дзень Перамогі. Вучні старшых класаў пойдуць на мітынг да помніка невядомаму салдату ў вёсцы Грамкі. Ігнат збіраўся ісці на гэтае мерапрыемства ўпершыню.

"І навошта прыдумалі гэтыя мітынгі? Гэта ж пяць кіламетраў трапаць да той вёскі. Лепш бы я паспаў яшчэ, а потым у камп'ютарныя гульні пагуляў бы. Вайна скончылася 68 гадоў назад. Даўно пара пра яе забыць!" – абурана думаў хлопец. І такая лянота яго агарнула. Ён павярнуўся на другі бок і заплюшчыў вочы.

У гэты момант у пакой зайшла мама.

– Добрай раніцы, сынок! – прывіталася яна.

–Добрай… – буркнуў сын.

–Што гэта за настрой у цябе?! – здзівілася мама. – Сёння ж свята – Дзень Перамогі! Ты што, такі кіслы да помніка пойдзеш?

–Што гэты помнік… прыдумалі нешта… не паспаць, не пагуляць у свята…

–Я з табой не згодна, Ігнат! – строга сказала мама. – І ты хутка сам зразумееш, што ня правільна разважаеш. Кветкі не забудзь, – нагадала яна і выйшла з пакоя.

– Навошта яны мне… гэтыя кветкі…, – прабурчаў сын.

Праз гадзіну Ігнат разам з аднакласнікамі крочыў у вёску Грамкі да помніка. Сярод настаўнікаў і школьнікаў панаваў узвышаны святочны настрой. Усе неслі букеты рознакаляровых цюльпанаў, белых нарцысаў і іншых майскіх кветак. Толькі Ігнат быў без букета. Але хлопец не надта перажываў. "Ну і што… падумаеш…"

Час прабег хутка. Дарога не здоўжылася. І вось яны ўжо класамі строіліся ля помніка.

Мітынг распачаў дырэктар школы. Ён расказаў пра жудасныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Колькі гора і пакут яна прынесла мірнаму беларускаму народу, колькі людзей загінула ў гэтай страшнай вайне.

У сваіх прамовах выступоўцы дзякавалі старэнькім ветэранам, якія прыйшлі да помніка, каб ушанаваць памяць загінуўшых салдат, сяброў, аднавяскоўцаў. Вучні таксама дзякавалі ім за 68 год мірнага светлага дзяцінства. Чыталі вершы і спявалі песні.

Ігнат стаяў насупраць помніка і пранікнёна ўглядаўся ў твар невядомаму салдату. Гэта быў малады прыгожы мужчына ў ваенным абмундзіраванні з накінутым на плечы плашчом. На мужным твары застыла лёгкая ўсмешка. Добрыя вочы пазіралі кудысьці ўдалечыню. У адной руцэ салдат трымаў пілотку, а другая – напружана сціскала апушчаны аўтамат. Мабыць, гэта азначала, што вайна ўжо скончылася, але, калі спатрэбіцца абараняць Радзіму, салдат без роздуму ўскіне яго і адважна кінецца ў бой.




“Імя тваё невядомае – подзвіг твой  бессмяротны”, – прачытаў Ігнат словы, высечаныя на пастаменце. Каля помніка знаходзіліся дзве магілы з захаваннем астанкаў невядомых салдат, якія былі знойдзены ў 1967 годзе ў вёсцы Прудзяны, калі будавалі школу. Вось тады і было вырашана  паставіць помнік невядомаму салдату.

Хлопец зноў узняў вочы на помнік.  Заліты сонечным святлом, ён здаваўся больш велічным і ўрачыстым.  У гэты момант Ігнату здалося, што салдат  пазірае на яго з дакорам:

– Цаною свайго жыцця мы адстаялі, абаранілі Радзіму, заваявалі мір, каб ты спаў спакойна, вучыўся ў школе. Ведаеш, колькі такіх жа маладых людзей, колькі  дзяцей загінула ў гэтай жудаснай вайне? Колькі невядомых магіл ёсць яшчэ на франтавых палях?

Ігнат апусціў вочы. Яму стала сорамна.

“Можа,  гэтаму  салдату было столькі ж гадоў, колькі цяпер майму тату?  – разважаў хлопец. – Можа, з вайны яго чакалі дзеці, а ён не вярнуўся – загінуў. Колькі роспачы і гора было яго бедным дзецям і жонцы! А самае страшнае, што яны нават не ведаюць, дзе ён пахаваны. А колькі салдат не вярнулася з фронту!  Колькі такіх жудасных, пакалечаных лёсаў!”

Сэрца Ігната балюча пракалола, да горла падступіў тугі камяк.  На душы зрабілася прыкра-прыкра. Хлопцу было балюча, сорамна за свае словы, за паводзіны. За тое, што нават маленькую падзяку – букет кветак – пакінуў дома. Хлопец пачырванеў.

Пасля мітынгу ўсе вучні ўскладалі вянкі і букеты да помніка невядомаму салдату. Ігнат апусціў галаву і адышоў убок. Потым усе моўчкі разыходзіліся дамоў.

– Чаму ты такі пануры? – спытаў Ігната Кастусь.

– Шкадую, што кветкі не ўзяў. Я ж зусім па-іншаму мітынг уяўляў. А цяпер у душы штосьці перавярнулася, – шчыра прызнаўся хлопец.

–Ды кінь ты… мітынг як мітынг… помнік як помнік… Кожны ж год ходзім. Давай лепш адпачнём і пад вечар у футбол згуляем, – прапанаваў Кастусь.

Ігнат прамаўчаў. У яго былі іншыя меркаванні.

Прыйшоўшы дадому, ён схапіў букет, нарваў яшчэ ў агародзе кветак, сеў на веласіпед і памчаўся назад у Грамкі.

– Мы будзем шанаваць памяць пра вас, абаронцы Айчыны, салдаты, героі, вызваленцы ад фашысцкага іга. Дзякуй вам за мірнае дзяцінства, – уголас прамовіў Ігнат і паклаў кветкі да ног салдата. – Як добра, што ў нашай краіне ніхто не забыты, нішто не забыта! І так будзе заўсёды, – шчыра заверыў хлопец.

## БУКЕЦІК САЛДАТУ

*Праўдзівая гісторыя, якая*
*адбылася з маёй сяброўкай,*
*калі яна вучылася ў школе…*

Ясным вясновым днём першакласніца Люда вярталася са школы. Дзяўчынка сціскала ў руцэ букецік пралесак. Яна так чакала, калі растане снег і расквітнеюць гэтыя першыя веснавыя кветкі. Люда чула ад дарослых, што ў суседняй вёсцы Грамкі стаіць помнік невядомаму салдату, які абараняў Радзіму. Дзяўчынка з кінафільмаў ведала пра жудасці вайны, пра спаленыя вёскі, пра дзяцей сірот, у якіх загінулі на вайне родныя і блізкія людзі. Таму доўгімі зімовымі вечарамі яна марыла схадзіць да гэтага помніка, падарыць салдату кветкі і асабіста падзякаваць за мірнае дзяцінства.

Люда прыйшла дадому, пераапранулася і з букецікам рушыла да помніка. Ісці да вёскі Грамкі было тры кіламетры. Але гэта не палохала дзяўчынку. Яна была ўпэўнена, што нічога не здарыцца, бо яна робіць добрую справу.

Дзяўчынка прайшла праз Грамкі і падышла да помніка, які ўзвышаўся каля самай дарогі. Па шашы туды-сюды імчаліся машыны. Людзі з цікавасцю пазіралі на дзяўчынку, якая горда несла букецік пралесак салдату. І Людмілцы было так прыемна, ганарова, што на яе ўсе звяртаюць увагу.

Дзяўчынка бачыла помнік упершыню. Ён быў такі вялікі ў параўнанні з жывымі людзьмі, што Людмілцы зрабілася страшна. Але гэтае ўражанне хутка змянілася, таму што твар у салдата быў добры, з лёгкай усмешкай.



Дзяўчынка зайшла за агароджу, паклала на пастамент кветкі, пакланілася і сказала:

– Дзякуй табе, салдат, што мужна абараняў Радзіму. Сваім жыццём ты заплаціў, каб мы маглі вучыцца і жыць пад мірным небам!

Яна ўзняла вочы, і ёй падалося, што салдат усміхнуўся. Люда таксама ўсміхнулася. Доўга яшчэ яна стаяла каля помніка. Дзяўчынка так паглыбілася ў свае думкі, што не заўважыла, як пачало змяркацца. Сонейка схавалася за лес, вясновы дзень канчаўся. І тут Люда ўспомніла, што не вывучыла ўрокі, што заўтра можа атрымаць двойку.

– Не, не атрымаю, – супакойвала сябе дзяўчынка, – мне ж салдат дапаможа… Ён вунь які мужны, вялікі, з аўтаматам…

Тым часам мама Людмілкі занепакоілася. Куды ж прапала дачка? Мама абышла ўсіх суседзяў і сяброваак Люды. Але ніхто пра яе нічога не ведаў.

Было ўжо цёмна, калі дзяўчынка падыходзіла да сваёй вёскі і ўбачыла людзей з ліхтарамі. Яны бегалі, мітусіліся па полі, каля лесу.

– Лю-ю-ю-да! Лю-ю-ю-дачка! – данёс да Людмілкі словы вецер.

“Гэта ж яны мяне шукаюць!” – шыбанула думка ў галаве. Дзяўчынцы ажно горача зрабілася. Ну, дастанецца мне ад мамы!”

Ніколі не забудзе Люда, як на яе крычала мама, што не папярэдзіла – без дазволу пайшла ў чужую вёску. Але яшчэ мацнейшы стрэс атрымала дзяўчынка, калі назаўтра настаўніца паставіла ёй па рускай мове двойку за тое, што Люда не выканала хатняе заданне.

З апушчанай галавой дзяўчынка ішла дадому. На душы было цяжка, балюча і крыўдна. Хаваючы вочы, яна ўвайшла ў хату.

– Што здарылася? – усхвалявана спытала мама.

– Я атрымала двойку, – заплакала дачка, – а ўсё таму, што да помніка

хадзіла і заданне не выканала! Я была ўпэўнена, што калі робіш добрую справу, табе дабром адплачваецца, а тут выйшла наадварот.

– Дык ты ж не сказала настаўніцы, па якой прычыне не вывучыла ўрок, – сказала мама.

– Я верыла, што мне дапаможа салдат, таму што я яму занесла кветкі, – выціраючы слёзы, шаптала дзяўчынка.

– Ну, гэта твае дзіцячыя фантазіі, салдат жа не жывы, як ён табе мог дапамагчы, – усміхнулася мама, – не плач, заўтра ўсё раскажаш настаўніцы і выправіш двойку, – суцешыла яна і абняла дачушку.

## МУЗЕЙ ЦЁТКІ

Арына прачнулася на досвітку і больш не змагла заснуць. Дзяўчынка баялася спазніцца ў школу. Сёння пераможцы раённай алімпіяды па беларускай мове пабываюць у аграгарадку Астрына. З іх класа паедуць толькі Арына і Света. Дзяўчынкі занялі першае і другое месцы ў алімпіядзе. Арына даўно марыла з’ездзіць на экскурсію ў музей знакамітай пісьменніцы-зямлячкі Цёткі. А сёння яны едуць менавіта ў гэты музей. Пятнаццатага ліпеня, у дзень нараджэння Цёткі, усе вучні іх класа пабывалі ў Старым Двары на яе магіле. Арына ведала, што Алаіза Пашкевіч (Цётка) нарадзілася ў фальварку Пешчын Шчучынскага раёна ў шляхетнай сям’і. Дзяўчынцы вельмі падабаюцца вершы знакамітай паэткі. Некаторыя з іх яна ведае на памяць. Дзяўчынку здзіўляла тое, што пісьменніца пражыла толькі сорак гадоў, але паспела шмат зрабіць для беларускай літаратуры.

Аўтобус павольна спыніўся каля астрынскай сярэдняй школы.




– Ого! Які вялікі помнік! – усклікнуў Сяргей, убачыўшы за акном помнік Цётцы.

– Так, гэта помнік нашай зямлячцы-паэтэсе Алаізе Пашкевіч, – адказала настаўніца Вера Пятроўна.

Дзеці выйшлі на вуліцу і накіраваліся да помніка. Нібы жывая, Цётка запрашала іх у школу. Вучні з захапленнем разглядалі помнік.

– Бачыш, які сур'ёзны ў Цёткі пагляд, якія прыгожыя рысы твару, – прашаптала Света Арыне.

– Так, прыгожая жанчына. І з кнігай у руцэ, – дадала Арына, – яна ж была не толькі пісьменніцай, але і настаўніцай.

"Цётка. Алаіза Пашкевіч 1876–1916 г.г." – было высечана на пастаменце.

Да дзяцей падышла завуч школы і запрасіла ў музей. Яна пачала расказваць, што заснавальнікам музея з'яўляецца настаўніца беларускай мовы і літаратуры Галіна Багумілаўна Пугач. Разам з вучнямі старшых класаў па драбніцах збірала яна звесткі пра Цётку: фотаздымкі, рукапісы, даўнія рэчы. Рассылалі лісты ў архівы Літвы, Польшы. І, нарэшце, у 1982 годзе адкрыўся музей.







У першай зале знаходзіліся звесткі пра жыццёвы і творчы шлях Цёткі. Каля кожнага стэнда стаялі вучаніцы школы і па чарзе паказвалі і расказвалі пра экспанаты. Тут знаходзіліся кнігі, рукапісы, фотаздымкі пісьменніцы.

Арыну прыемна здзіўляла тое, што Алаіза Пашкевіч вельмі любіла дзяцей – рупілася пра іх. Хацела, каб беларускія дзеткі і бедныя, і багатыя былі пісьменныя. Для іх яна напісала першы буквар “Лемантар” і “Першае чытанне для дзетак беларусаў”. У музеі захоўваюцца арыгіналы гэтых кніг, і дзеці з захапленнем разглядалі іх. Тут жа знаходзіліся і іншыя кнігі паэтэсы. Гэта – “Колядная пісанка”, выдадзеная ў 1913 годзе, кніга-арыгінал “Выпісы з беларускай літаратуры” – 1923 года. У ёй змешчаны вершы Цёткі і іншых беларускіх аўтараў. У кнізе “Выбраныя творы” надрукаваны самыя лепшыя творы паэтэсы. Побач з кнігамі змешчаны фотаздымак і зборнік “Дудка беларуская” Францішка Багушэвіча (Мацея Бурачка) – славутага беларускага пісьменніка. Ён быў духоўным настаўнікам Цёткі. Дзецям паказалі пасведчанне аб заканчэнні ў 1904 годзе Санкт-Пецярбургскай Аляксандраўскай жаночай гімназіі, экзамены за якую Алаіза здала экстэрнам. У гэтай жа зале знаходзіўся буфет з хаты Пашкевічаў і насценны гадзіннік таго часу, копіі многіх дакументаў, рукапісы вершаў, лісты Цёткі да яе сяброў, фотаздымкі родных. Дзяўчынкам Свеце і Арыне вельмі спадабаўся партрэт Цёткі, які напісаў Абрам Зембораў у 1976 годзе, а таксама бюст Цёткі ў выкананні Валянціны Галубкінай. Сяброўкі сфатаграфаваліся каля яго.




Вучні з захапленнем разглядалі стэнд з фотаздымкам нашага земляка з Наваградчыны, класіка польскай літаратуры Адама Міцкевіча, ліст Максіма Багдановіча да Цёткі з просьбай выпісаць яму газету “Наша Ніва” у 1908 годзе. Побач – фотаздымак славутага беларускага песняра Якуба Коласа. А таксама фотаздымак Цёткі ў нацыянальным адзенні.

– Дарэчы, дзеці, ці ведаеце, што Цётка закончыла і тэатральныя курсы? – спытала настаўніца Ала Сямёнаўна.

– Я ведаю, – падняў руку Віця Чэрнік, – яна ўдзельнічала ў спектаклях

тэатра Ігната Буйніцкага.

– Так, малайчына, – пахваліла Ала Сямёнаўна. – Гэта быў першы беларускі тэатр. Цётка актыўна іграла ў спектаклях. Яна знаходзіла ў майстэрнях, на заводах аматараў танцаў, маладых дзяўчат з прыгожымі галасамі і прыводзіла да Буйніцкага. Аб гэтым сведчаць і фотаздымкі.

– Глядзі, які цудоўны фотаздымак, – шапнула Арына Свеце, – гэта ж вядомая дзіцячая пісьменніца Зоська Верас.

– Ага, прыгожая, як артыстка, – пагадзілася Света. – А вось і Канстанцыя Буйло. Тут напісана, што яна была сяброўкай Цёткі.

Светлавалосая дзяўчына запрасіла экскурсантаў у наступную залу, прысвечаную пісьменнікам Гродзеншчыны і Шчучыншчыны.Тут дзеці ўбачылі кнігі і фотаздымкі сучасных паэтаў і пісьменнікаў – Юркі Голуба, Данутв Бічэль, Мар'яна Дуксы, Марыі Шаўчонак. Сярод сучасных кніг, за шклом стаялі зборнікі вершаў: "Непераможны колер охры" Людмілы Кебіч, "Зямлі маёй нераўнавага" – Браніслава Ярмашкевіча, "Мой светлы дзень" – Ірыны Данік і іншых пісьменнікаў Гродзеншчыны.




У трэцяй зале, этнаграфічнай, дзецям паказалі незвычайныя старажытныя рэчы.

– Гэтыя рэчы вучні нашай школы адшуквалі ў сваіх бабуль у старых хатах, кладоўках і прыносілі ў музей, – пачала расказваць дзяўчына-экскурсавод.

– Што гэта? – спытала Арына, паказваючы на старажытны прас, – нейкі паравоз.

– Гэта прас, – усміхнулася Света, – я такія бачыла ў іншых музеях.
Тут жа знаходзіліся валок і качалка, якімі ў даўніну раскатвалі бялізну, каб была гладкай і мяккай. Цэп, якім малацілі збожжа.

– А гэта ручная маслабойка, – сказаў Сеня, паказваючы на драўляную бочачку з палкай у прасвідраванай крышцы.

– А я ў бабулі масла біў у такой, – дадаў Валера.





У куфэрку, які стаяў каля сцяны, захоўваліся саматканыя і вышытыя рознымі ўзорамі ручнікі. Побач знаходзіўся калаўрот, на якім раней пралі, а таксама

прылады для кроснаў (ткацкага станка) – матавідла і бёрда. На вышытым ручніку стаяў гаспадар-самавар.

Неўзабаве экскурсія закончылася. У кнізе для гасцей Вера Пятроўна зрабіла запіс: падзякавала за цікавую і пазнавальную экскурсію.

Арына зазірнула ў суседнюю залу і яшчэ раз прачытала словы Цёткі, якія ўразілі яе больш за ўсё:

“Думаць усюды аб народзе,
Родны край усюды сніць.”




“Сапраўды, наша славутая, чуллівая зямлячка Алаіза Пашкевіч вельмі любіла беларускі народ, рупілася пра дзетак, каб вучыліся яны ў школах і жылі лягчэй, чым іх бацькі, каб гучала беларуская мова. Здзейсніліся яе мары… І, напэўна, удалечыні ад роднага краю, Алаізе снілася любая старонка, родны кут, цёплыя матуліны рукі…,” – пакідаючы музей, падумала дзяўчынка.

# КУЦЫ ЛЕС

*Гэтае апавяданне я прысвячаю сціпламу куточку ў Шчучынскім раёне. Маёй маленькай вёсачцы, дзе я нарадзілася, дзе жывуць мае бацькі, дзе я першы раз вымавіла слова “мама”, дзе зрабіла першыя крокі. А таксама першыя паэтычныя і пісьменніцкія спробы, бо менавіта адтуль, са свайго дзяцінства, я чэрпаю вобразы для сваіх твораў.*

– Паўлік, чаму маміна вёска называецца Куцы Лес? – задумліва пытаецца ў старэйшага брата Віталік.

– Не ведаю. Ніколі пра гэта не задумваўся. А сапраўды, чаму Куцы Лес? Пойдзем да дзеда і спытаем. Ён, напэўна, ведае пра сваю вёску.

Хлопцы падышлі да дзеда Іосіфа, які сёк дровы.

– Дзядуля, адпачні трохі, прысядзь. Мы хочам у цябе спытаць: адкуль такую назву мае вёска – Куцы Лес? Раскажы нам, калі ласка. А мы потым дапаможам табе дровы паскладваць.

Дзед выцер пот і прысеў на калодку, на якой толькі што сёк дровы. Хлопцы прымасціліся на непасечаных кругляках.

– Пра вёску нашу хочаце ведаць? – перапытаў дзед, збіраючыся з думкамі. – Раскажу, што бацька мне пра яе расказваў, што памятаю са свайго дзяцінства. Куцы – гэта азначае малы, сціплы. Вёска сапраўды малая. Асабліва цяпер, калі моладзь у гарады падалася, а старыя дажываюць тут свой век. А Лес, таму што вакол вёскі куды ні глянь лес расце. Некалі, у маё дзяцінства, лес рос і на тым полі, – дзед паказаў на загуменні. – А адразу за вёскай, дзе цяпер кароў пасём, быў прыгожы беразняк. Там раслі бярозы, нібы нявесты на выданні ў белых сукенках. Такая прыгажосць была! Салаўі заліваліся. Соку на ўсю вёску хапала. А грыбоў! Падбярозавікаў хоць касой касі. Іх нават не збіралі. Хіба што дзе які маладзенькі грыбок.



– А там і цяпер бярозкі маладыя растуць, – перабіў дзеда Паўлік.

– Гэта ж праз колькі гадоў, – дзед задумаўся, – гадоў шэсцьдзясят прайшло, хіба, падняліся маладыя дрэўцы. Іх ніхто не садзіў. Відаць, з тых самых бярозавых каранёў прараслі, што не змаглі выкарчаваць. Бачыце, якая прага да жыцця! Яшчэ раней, мой бацька расказваў, вёска была раскідана па хутарах. На кожным – гаспадарка. Гаспадары мелі па вялікім кавалку зямлі. Апрацоўвалі яе: аралі, сеялі, жалі, – і ўсё ўручную. Не так, як цяпер – камбайнамі ды трактарамі. Гадавалі кароў, свіней ды другую жыўнасць. З гэтага і жылі. А дзяцей у сем'ях было не па двое-трое, як цяпер, а па дзесяць-дванаццаць. Потым дзеці выраслі, стваралі свае сем'і, будавалі хаты, і вёска павялічвалася.

Хлопцы глядзелі на дзеда яснымі вочкамі і з захапленнем слухалі. А дзед працягваў:

– Яшчэ вакол вёскі, да рэчкі Нявішы, вунь белы мосцік віднеецца, кругом балота было. Вясною, калі раставаў снег, да Новага Двара было не дабрацца. Як на востраве жылі. Ужо потым, пасля вайны, балота асушылі. Выкапалі канавы – вада туды і сышла. А вёска ўсё разбудоўвалася. Сюды перасяліліся з хутароў. Гадоў трыццаць назад тут кіпела жыццё. У кожнай хаце дзеці гадаваліся, у школу хадзілі. Мы з бабуляй толькі сямёра дзяцей выгадавалі. Гэта цяпер у вёсцы сумна, адны старыя засталіся, а тады цікава было: клуб працаваў, танцы ладзілі. Моладзь весялілася. Канцэрты самі арганізоўвалі, выступалі. А якія навагоднія вечары былі! Дзед Мароз і Снягурка конкурсы праводзілі на лепшы маскарадны касцюм. Падарункі ўручалі ўсім. Нікога не крыўдзілі. А потым на тройцы коней Дзед Мароз са Снягурачкай развозілі падарункі дзецям па хатах. Як у казцы было – цікава! Дзеці вершы і песні загадзя вучылі. Рыхтаваліся да сустрэчы з навагоднімі гасцямі.

– Дзед, а ў вас самая вялікая сям' я ў вёсцы? – цікавіцца Віталік.

– Так. Вы ж самыя багатыя на цётак і дзядзькаў. Ды на стрыечных братоў і сясцёр. Паўлік, пералічы, колькі ўжо ўсіх у нашай сям'і.

Паўлік пералічыў:

– Дзед, ужо трыццаць сем чалавек.

– Во, бачыш, якая сям'я! – ганарыўся дзед.

– У вас з бабуляй толькі адных унукаў шаснаццаць і праўнукаў трое – дадаў Віталік.

– Яшчэ раскажу вам, хлопцы, пра бярозу, што расце за вёскай, – працягваў свой аповед дзядуля.

– А, ведаю, мы кожны раз каля яе праязджаем, калі да вас едзем. Тоўстая такая, моцная, – здагадаўся Віталік.



– Я яшчэ малы быў, яна ўжо вялікая была. Бацька мой расказваў, што каля яе раслі яшчэ дзве бярозы, але тыя высахлі. Гэтай бярозе больш за сто пяцьдзясят гадоў будзе. Кожны дзень дзеці каля яе ў школу хадзілі. А яна іх вітала, калышучы абвіслымі галінкамі. Ад дажджу іх хавала. Так і цяпер стаіць, дужая яшчэ і моцная, толькі адна. Мабыць, набралася маладой дзіцячай энергіі на доўгае жыццё. І не страшныя ёй ні буры, ні навальніцы. А ці ведаеце, што ваш дзядзька Іван у школу зусім не хацеў хадзіць? Калі ў першым класе быў, падыдзе з дзецьмі вось да гэтай самай бярозкі, і ўсе дзеці далей у школу ішлі, а ён дадому вяртаўся.

– Ведаем, ведаем, – смяюцца ўнукі, – мама расказвала. – Затое потым лепш за ўсіх вучыўся. На алімпіядах па матэматыцы і фізіцы першыя месцы атрымліваў. Пасля школы тэхнікум і ўніверсітэт скончыў. Ужо дваццаць гадоў сваёй уласнай фірмай кіруе.

– І так бывае, – згаджаецца, смеючыся, дзед.

– Дзед, а чаму каля бярозы крыж стаіць? – запытаў Віталік.

– Крыж лічыцца святым месцам у вёсцы. Каля гэтага крыжа, калі чалавек памрэ і яго вязуць на могілкі, сваякі памерлага просяць у людзей прабачэння за ўсё кепскае, што, можа, зрабіў ім нябожчык.

– Вось як! – дзівяцца хлопцы. – Мы гэтага не ведалі.



– Глядзіце, наш бусел ляціць! – раптам выкрыкнуў Віталік. Усе паднялі галовы.

– Над хатай кружыў бусел. Лапочучы магутнымі крыламі, прысеў набуслянку.

–І не баіцца ён тут так нізка, на грушы, гняздзіцца? – разважаў Паўлік. Вясною на гэтае гняздо яшчэ адзін бусел прылятаў, – сказаў дзед, – бойка была. Я аж здзівіўся! Гэты дужэйшы – адваяваў сабе жыллё. Юра пашкадаваў другога бусла і зрабіў каля хлява яшчэ адно гняздо. Але той, відаць, пасля бойкі не захацеў быць суседам. Пасяліўся на воданапорнай вежы. Збудаваў там себе буслянку. Ну, добра, хлопцы, пара за працу. Я буду сячы дровы, а вы, як і абяцалі, – складвайце іх.

– Добра, дзядуля.

І ўнукі ўзяліся за справу.

## СІРОЧЫЯ СЛЁЗЫ

*У аснову гэтага апавядання пакладзена цяжкае сірочае дзяцінства маёй мамы, якая ў пяць гадоў засталася без маці, а ў сем – без бацькі.*

– Гэта магіла тваёй мамы, – сказаў Пятро.
Марыйка глядзела на заросшы травою прыгорачак і плакала. Са слупочка з крыжам, у круглай аправе , з фотаздымку на яе паглядала маладая жанчына – яе мама. Сірочыя слёзы цяклі па шчаках дзяўчынкі, падганяючы адна адну. Марыйка не разумела, чаму так рана мама пакінула яе. Яна не ведала матчынай ласкі і клопату. Як скрозь сон, дзяўчынка памятае любы твар матулі. Калі яна памерла, Марыйцы было толькі пяць гадоў.

– Тата, ад чаго памерла мама? Ты ніколі мне аб гэтым не расказваў, – крыху супакоіўшыся, запытала дзяўчынка.

– Яна захварэла на грып. Не шанавала сябе, і хвароба дала ўскладнне на сэрца.

– Чаму ты не адвёз маму ў бальніцу? – з папрокам дапытвалася дачка.

– Мама не хацела, дый такую хваробу лячыць вельмі складана. З кожным днём ёй рабілася ўсе горш і горш. Вясною, калі прыгрэла сонца, мама прасіла мяне, і я выносіў яе пагрэцца. А ты, Марыйка, сядзела каля яе і гуляла. Мама тулілася да цябе, бо адчувала, што ўжо пакідае нас. Яна была зусім слабая.

– Трэба было адвесці маму ў бальніцу. Там яе вылечылі б дактары, – не згаджалася Марыйка.

– Можа і трэба было быць больш настойліваму, – уздыхнуў бацька.

– Мамачка, – шаптала плачучы сірата, – чаму ты сябе не даглядзела? Каб ты жыла і маё жыццё было б лягчэйшым.

Яны стаялі каля магілы, – бацька і дачка, аплакваючы страту самага роднага чалавека.

– Пойдзем, дочачка, – сумна сказаў бацька, – маму ўжо не вернеш.
Дзяўчынка паклала на магілу букецік палявых кветак і, апусціўшы галоўку, рушыла за бацькам.

Жыццё Марыйкі было цяжкім. Мачаха не любіла яе. Рана будзіла і прымушала рабіць розную працу, якую павінна была рабіць сама. Бацька спрабаваў заступіцца за дачку, але злая мачаха толькі абуралася ўжо на іх абоіх. Паскардзіцца не было каму. Выліць сваю самоту дзяўчынка магла толькі, паплакаўшы, дзе ў куточку. Не магла яна прабачыць свайму лёсу за тое, што так рана пазбавіў яе матулі, а разам з ёй і дзяцінства. Таму на жыццё глядзела не па-дзіцячы, а па-даросламу.
У Марыйкі быў малодшы брацік Васілёк, але ён памёр у трохгадовым узросце ад туберкулёзу. Яна не зусім ясна, але памятае, як любіла брацікa, як яны разам бегалі басанож па хаце. А потым памятае маленькую труну, у якой ляжаў нерухома брацік. Сястрычка не разумела, чаму ён не ўстае, чаму не хоча з ёй пагуляць? Не разумела, таму, што самой было толькі чатыры з паловай гадочкі.
У сямігадовым узросце Марыйка засталася і без бацькі, які яе любіў і шкадаваў. Яна памятае яго добрую ўсмешку, шурпатыя, але ласкавыя рукі, якія часта яе абдымалі. Не стала і гэтай ласкі – бацькавай. Цяжкая хвароба забрала адзінага роднага чалавека на зямлі.

Марыйка перайшла жыць да цёткі Алены, мацярынай сястры. Мачаха не захацела гадаваць дзяўчынку. Ды і дзяўчынка не мела ахвоты заставацца ў чужой жанчыны. Цётка Алена і дзядзька Іван мелі  вялікі надзел зямлі, многа хатняй жывёлы. Яны, нават, нанімалі работнікаў, якія працавалі за грошы, а часам і за кусок хлеба. Быў у цёткі адзіны сын Міхась. Мамін сынок-пестунок, малодшы за Марыйку на два гады. Любіў ён доўга спаць, смачна есці і нічога не рабіць. У шасцігадовым узросце Міхась не ўмеў нават сам апранацца. Марыйка, устаўшы рана і парабіўшы сваю работу, павінна была яго апрануць і за ручку прывесці  да стала на сняданак.

Калі надышла вайна, дзядзьку Івана і многіх работнікаў забралі на вайну. Вялікая гаспадарка засталася на плячах цёткі, а значыць, і на кволых плячах Марыйкі. Жыццё стала яшчэ цяжэйшым. Дзяўчынка ўставала вельмі рана. Працавала нароўні з дарослымі – сеяла, жала, хаця ёй было толькі восем гадоў. Бывала выконвала напасільную  працу. Цётка таксама шмат працавала, таму  не шанавала і пляменніцу.

Аднойчы, парабіўшы сваю работу, Марыйка прыйшла апранаць Міхася,але той яшчэ спаў.Будзіць нельга было, пакуль сам не прачнецца. Дзяўчынцы так хацелася есці, што амаль млела ад слабасці. А без Міхася за стол не сядзеш. Яна зайшла ў каморку. На стале стаяў збанок малака і ляжаў бохан хлеба. Дзяўчынка адрэзала лустачку хлеба. Крадучыся, пачала яго есці, пакрысе запіваючы  малаком.  Увесь час прыглядвалася, ці не пазначылася адпітаемалако ў збанку. У гэты момант у каморку забегбосы Міхась.

– Ага! Малако п’ еш без дазволу! – закрычаў ён. – Мяне не апранула! Я ўсе маме раскажу!

– Хадзем, Міхаська, я цябе апрану, – ласкава сказала Марыйка.

Але пестунок крычаў  яшчэ мацней, напэўна, каб маці пачула.

– Што здарылася? – сур’ ёзна спытала цётка Алена, якая прыбегла на крык.

– Яна мяне не апранула і малако піла без дазволу.

Цётка нічога не сказала, толькі строга глянула на пляменніцу. Ад гэтага позірку ў дзяўчынкі аж  сэрца зайшлося. Не раз Марыйка  плакала, забіўшыся ў куточак, ад несправядлівай крыўды.

Так ішло жыццё. Пасля вайны Марыйка пайшла ў школу. Старанна вучылася, а пасля заняткаў працавала. Яна гадавала  дзяцей старшыні калгаса. Зарабляла сабе на такое-сякое жыццё. Жонка старшыні калгаса, Зінаіда Пятроўна,была настаўніцай. Добрая і чулая жанчына  не крыўдзіла Марыйку. Кожны дзень старалася смачна накарміць сірату. А Марыйка, у сваю чаргу, была ёй удзячна. Яна пільна глядзела дзяцей і чыста прыбірала ў хаце. Хоць гэтага ёй не даручалі. Гаспадары палюбілі шчырую дзяўчыну. Аднойчы Марыйка не дапільнавала малодшага Грышку, той упаў з ложка і стукнуўся галавой аб падлогу. У гэты момант у хату зайшла Зінаіда Пятроўна. Яна ўбачыла спалоханую да слёз Марыйку, якая трымала Грышку на руках і пяшчотна супакойвала яго, а малы моцна плакаў.

– Зінаіда Пятроўна, я не дапільнавала. Грышка ўпаў і пабіў лоб, – хвалюючыся паведаміла  дзяўчына.

– Нічога, галоўнае, каб сіняка не было, а то Мікалай Сямёнавіч будзе незадаволены. І яна пачала прыкладваць да ілба дзіцяці розныя халодныя прымочкі.

Марыйка расла добрай, чулай і зычлівай. Не забывала яна пра сваіх бацькоў і малодшага брата. Наведвала і даглядала іх магілы. Кожнаму несла букецік жывых кветак. Размаўляла з матуляй, як з жывой. Расказвала пра сваё нялёгкае жыццё, нібы хацела пачуць матчыну спагаду і параду. Але ў адказ было маўчанне. Боль сціскаў сірочае сэрца, а на зямлю падалі слёзы.

Кончылася дзяцінства, якога і не было. Нібы кветка расквітнела Марыйка. Здзіўляла сваёй прыгажосцю не толькі тутэйшых хлопцаў, але і далёкіх. Прыйшло юнацтва, таксама без мацярынскіх парад і падказак. І лёс рыхтаваў дзяўчыне новыя выпрабаванні.





*У раздзеле* ***“Кошык прымавак”*** *я стаpалася адлюстраваць сэнс прымавак і прыказак, якія найчасцей сустракаюцца ў нашай рэчаіснасці.*

## ПРЫ СОНЕЙКУ ЦЁПЛА, ПРЫ МАМАЧЦЫ ДОБРА

казка

У коткі Муські падрастала пяцёра кацянят – Белахвосцік, Беланосік, Белавушка, Белалапка і Рыжык. Цешылася Муська са сваіх любімцаў, карміла смачным малачком, лашчыла іх, цалавала ім мордачкі. Кацяняткі падрасталі хутка. Муська выводзіла дзетак на вуліцу, і пушыстыя камячкі гулялі-скакалі ў высокай траве, грэліся на сонейку.

Калі дзеці выраслі, Муська сказала:

– Цяпер вы павінны навучыцца лавіць мышэй. Гэта ваша асноўнае прызначэнне. Людзі вельмі любяць кемлівых і спрытных катоў і вельмі не любяць надаедлівых грызуноў-мышэй. Я вам пакажу, як іх трэба лавіць. І вы будзеце паляваць самастойна.

Котка расказала дзецям пра ўсе свае хітрыкі і прыёмы. Кемлівы Рыжык адразу падаўся ў камору, таму што бабуля кожны дзень скардзілася на шкодніц-мышак, што грызуць бульбу, каўбасы, сала і ўсё, што там ляжыць. Белахвосцік пабег у хлеў, таму што мама Муська часта адтуль выносіла небаракаў-мышак. Беланосік пачасаў свой белы носік і паскакаў на агарод. А котачкі Белалапка і Белавушка не спяшаліся на паляванне. Яны разлягліся на траве і мурлыкалі песеньку. Але раптам убачылі, што з каморы, ганарова задраўшы мордачку, з мышкай у зубах, выбег Рыжык.

– Глядзі, Белалапка, Рыжык мышку панёс! – здзіўлена шапнула Белавушка. – У яго атрымалася яе злавіць!

Услед за Рыжыкам таксама з мышкай у зубах, выставіўшы белы хвосцік, з хлява выскачыў Белахвосцік. А праз некаторы час з агароду выбег Беланосік. Ён, задраўшы белы носік, таксама нёс мышку.

У Белалапкі і Белавушкі ажно вочкі засвяціліся, нібы зялёныя малахіты, так захацелася і ім злавіць мышку.

– Хуценька збірайся, Белавушка, і бяжым на калгаснае поле! Там цяпер жыта жнуць. І мышкі ажно кішаць, так зерне збіраюць, – сказала Белалапка, – мы зловім не па адной, а па некалькі!

Прыбеглі коткі на поле. А там, сапраўды, многа мышак. Прытаіліся коткі, сочаць, а потым знянацку – скок на мышку… Але тае і след прастыў. Высунуцца мышкі з норкі, коткі напужаюць іх, пабегаюць вакол, і ўсё на гэтым.

Пачало змяркацца. Сонейка пакацілася за лес адпачываць.

– Пойдзем і мы дадому, – сумна сказала Белавушка, – есці хочацца і стаміліся вельмі.

– Ты ідзі, а я не пайду, пакуль мышку не злаўлю, – заупарцілася Белалапка.

Засталася яна адна. Мышкі баяліся вылазіць з норак, таму што на полі свяціліся два зялёныя агеньчыкі Белалапкі. Хутка котачка стамілася, моцна хацелася есці і зрабілася холадна. У гэты момант над яе галавой нешта, свішчучы, праляцела.

– Мамачка-а-а! – спалохана замяўкала Белалапка і кінулася ўцякаць пад стажок саломы.

Яна вытрашчыла вочкі і здзіўлена пазірала на незнаёмую істоту, якая лётала над полем, махаючы крыламі, падобнымі на аэраплан.

“Гэта ж кажан, – лятучая мышка. Яна таксама палюе, – здагадалася котка. – Я напужала мышак, а мышка напужала мяне. Вось як бывае!”

Супакоіўшыся, Белалапка згарнулася клубочкам, прыгрэлася ў саломе і заснула.

Ёй сніліся мышы. Яны чарадою бегалі па полі, танцавалі, дражніліся. Белалапка хацела іх дагнаць, але, як гэта бывае ў сне, не змагла нават з месца крануцца. Хтосьці нябачны трымаў яе за хвосцік, і яе белыя лапкі толькі тупацелі на месцы.

Прачнулася котка ад таго, што адчула цяпло ў бачок. І хтосьці то свяціў ёй у вочкі, то жартаўліва цягаў за хвосцік. Яна расплюшчыла вочкі і ўбачыла сонечны Праменьчык.

– Дык гэта ты не даў мне злавіць мышкі ў сне? – надзьмуўшыся, спытала Белалапка.

– Не, не я! Але не сумуй, я табе дапамагу! – сказаў Праменьчык. – Зараз мышкі пачнуць вылазіць з норак. Я асляплю іх, а ты – лаві!

– Цудоўна прыдумаў! – узрадавалася котка.

Як толькі першая мышка высунула мордачку з норкі, Праменьчык ярка засвяціў ёй у вочы, а Белалапка скочыла са свайго схованішча і злавіла яе.

– Дзякуй! – крыкнула котка і ўбачыла, што Праменьчык падаўся ў высокае неба да свайго сонейка.

“І мне трэба бегчы да мамы!” – радасна падумала Белалапка.

Яна забегла ў хату, кінула ля парога мышку і скокнула да мамы Муські.

– Дзе ж ты бадзялася, дочачка? – спытала Муська, і пяшчотна пагладзіла котачку.

Белалапка маўчала, а толькі бесперапынна мурлыкала і лашчылася да мамы.

– Пры сонейку цёпла, пры мамачцы добра, – нарэшце прамяўкала яна, узняла свае радасныя вочкі на Муську і лізнула яе ў носік.

## СКОНЧЫЎ РАБОТУ – ГУЛЯЙ У АХВОТУ

казка

У Зайчыхі гадавалася двое зайчанят – Пушысцік і Чарнахвосцік. Пушысцік быў такі прыгожы і пушысты, як ні адзін заяц у лесе. А ў Чарнахвосціка, нібы мяцёлачка, быў чорны хвосцік.

Аднойчы Зайчыха-мама сказала Чарнахвосціку назбіраць зайцавай капусты, а Пушысціку нарваць на градцы морквы, каб было што на абед прыгатаваць.

– Хто не выканае маё даручэнне, гуляць не пойдзе! – сур'ёзна сказала мама. – Зразумелі?

– Зразумелі, – адказалі сыночкі, і пайшлі працаваць.

Чарнахвосцік узяў кошычак і накіраваўся на суседнюю палянку па купусту, а Пушысцік начапіў на вушы навушнікі, у кішэню паклаў плэер, уключыў музыку і, танцуючы, паскакаў на градку. І тут ён заўважыў карагод каляровых Матылькоў, якія весела кружыліся над духмянымі кветкамі.

– Во! – здзівіўся заяц. – Што гэта ў вас за свята?

– Сёння Дзень нараджэння Божай Кароўкі, – дружна адказалі Матылькі.

– Віншую, Божая Кароўка! – падскочыў Пушысцік.

– Дзякуй! – адказала імянінніца. – Станавіся з намі ў карагод!

– З задавальненнем! – не задумваючыся, згадзіўся заяц. – У мяне вось і музыка ёсць. Калі жадаеце – уключу?

– Жадаем! Жадаем! – весела запішчалі тоненькімі галасамі Матылькі.

Забыўшыся пра маміна даручэнне, зайчык да самага абеду скакаў-весяліўся з Матылькамі. Раптам ён убачыў Чарнахвосціка, які нёс цэлы кош капусты. Пушысцік схапіў свой кош, і хацеў бегчы на градку. Але ў гэты момант Зайчыха паклікала сыночкаў дамоў. Зайчык апусціў хвосцік, і паплёўся ўслед за братам.

– А дзе ж твая морква? – спытала яго мама.

– Я так загуляўся з Матылькамі, што не заўважыў, як прабег час, – апусціўшы вушкі, прызнаўся Пушысцік.

– Кепска, – незадаволена сказала Зайчыха, – пасля абеду пойдзеш працаваць.

– Добра, – згодна кіўнуў галавой зайчык.

– А ты, Чарнахвосцік, скончыў работу – гуляй у ахвоту! – усміхнулася мама.

## ЛЕПШ СТО СЯБРОЎ, ЧЫМ СТО РУБЛЁЎ

казка

Захацелася Дзятлу разбагацець. Надакучыла яму лічыць дробязь. Вельмі ж хацелася пажыць багата, пабываць у іншых краінах, адпачыць на лепшых курортах свету. Вырашыў ён стаць прадпрымальнікам.

“Буду дуплы рамантаваць, гнёзды птушкам будаваць і прадаваць. Гэта самая выгадная справа,” – думаў ён.

З ранку да вечара працаваў Дзяцел – выдзёўбваў на дрэвах дуплы, аздабляў прыгожа і прадаваў. І справа пайшла як па масле. Не паспее ён адно гняздо прадаць, як на другое ёсць пакупнік. Хутка разбагацеў прадпрымальнік, радуецца, грошы па дробязі не лічыць, ганарлівы стаў, дзюбу задраў. Ні з кім нават не вітаецца, не тое што сябруе. Як кажуць, “без дулі ні да носа!” Мары яго збыліся: адпачывае на курортах, па морах-акіянах плавае. Яхту сабе прыдбаў.

Але аднойчы здарылася бяда. Зламаў Дзяцел сабе дзюбу, а гэта – яго асноўная прылада працы. Засмучаны і пакалечаны, паляцеў ён да лясной лекаркі Савы. Прыляцеў і нават паскардзіцца не можа, бо замест голасу – сіпата. Але мудрая Сава ўсё зразумела і без слоў.

– Трэба пратэз за мяжою заказваць, – сказала яна і паклала Дзятла ў свой шпіталь. Ляжыць ён, сумуе і гаруе. Справа спынілася. Грошы не капаюць. Ніхто да яго не наведваецца, няма каму кроплю вады падаць.

– Дзяцел дзюбу зламаў! Дзяцел дзюбу зламаў! У шпіталі ляжыць! – аднойчы разнесла па лесе на хвасце Сарока.

Вырашыла Сінічка наведаць суседа Дзятла. Прыляцела яна і бачыць – ляжыць знямоглы багаты прадпрымацель з забінтаванай дзюбай, схуднеў без вады і яды.

– Бачыш, родненькі, – гаворыць яму Сінічка, – і багацце тваё тут не дапамагае. Не сябраваў ты ні з кім, толькі грошы лічыў і ў панчошку складваў. Забыліся ўсе пра цябе. А лепш, каб было ў цябе сто сяброў, чым сто рублёў.

Накарміла, напаіла добрая Сінічка суседа, цвыркнула і паляцела.

## ДЗЕ ЦЕСНА – ТАМ ПАЦЕШНА

казка

Мядзведзь, Ліса, Заяц і Воўк пабудавалі сабе хаты.

Мядзведзь вымураваў вялікі асабняк, пасадзіў сад, развёў пчол. Загарадзіў сваё падвор’е прыгожым шчыльным плотам, каб зайцы ды іншыя грызуны не пашкодзілі дрэў. Жыў ён багата, але ні з кім сваім дабром не дзяліўся, нікога ў госці не запрашаў.

Ліса таксама пабудавала сабе прыгожы дом з басейнам і тэрасай для адпачынку. Гультайкай яна была. Цэлымі днямі толькі загарала да аранжавага колеру, а працаваў Ліс. Ён хадзіў на паляванне, прыносіў з суседняй вёскі курачак, гусакоў ды іншых хатніх птушак.

І Воўк пабудаваў сабе вялікі дом. Са шматлікімі пакоямі для ваўчанят, каб жылі паасобку і не грызліся.

А Заяц са сваёй вялікай сям’ёй жыў у невялікай сціплай хатцы. Хоць і небагата жылося, але весела. Радаваўся са сваіх дружных дзетак і клапатлівай

жонкі. Не раз падсмейваўся з яго Мядзведзь, калі праходзіў каля зайцавай хаты.

– Ну, што гэта за будынак – павярнуцца няма дзе! – трасучыся, рагатаў ён.

– Табе няма дзе павярнуцца, а мае дзеці скачуць, гуляюць па хаце, і месца ўсім хапае! – коса пазіраў на Мядзведзя Заяц.

– Не, я ў такім жытле ні дня не жыў бы!

– Не плюй у крыніцу – прыйдзеш па вадзіцу! – мудра адказваў Касы.

Надышла восень з бурамі і навальніцамі. Аднаго разу здарылася бяда. Наляцеў моцны ўраган. Разбурыў асабняк Мядзведзя, паваліў дрэвы, раскрыў вуллі. Лісіная хата таксама пацярпела. Ад моцнага ветру зляцела ўся дахоўка са страхі. У Ваўка ўраган вокны з рамамі павырываў. А зайцава хата як стаяла, так і стаіць. Толькі вось капусту градам пасекла. Але вясёлыя Зайцы не вельмі засмуціліся.

– Нічога, заквасім усю капусту на зіму, – супакоіла мудрая Зайчыха.

Сеў Мядзведзь на паваленае дрэва, пазірае на разваліны, а з вачэй буйныя слёзы коцяцца.

“Дзе ж я буду зімаваць?” – схапіўся за галаву, ківаючыся збоку ў бок, думае ён.

Вырашыў Мядзведзь пайсці да Лісы.

– Суседка, пусці мяне перазімаваць, – папрасіў ён.

– Не, не магу! У самой, бачыш, гора – бура страху раскрыла.

– Дык я дапамагу, – прапанаваў Мядзведзь, – страху накрываць – не дом зноўку будаваць.

– Куды ж табе на страху лезці, Касалапы? Яшчэ звалішся, тады бяды з табой не абярэшся. Бяда ж не ходзіць адна, – выкруцілася Хітрая.

Згарнуўшыся ад гора і тугі, пашыбаваў Мядзведзь да Ваўка.

– Шэры, пусці перазімаваць, – папрасіў ён, – хата ў цябе вялікая.

– Ды што ты?! Мы з табой пад адной страхой ніколі не ўжывёмся! Мае дзеці ваўкамі выць будуць, калі ты зімою храпсці будзеш на ўсю хату, – адказаў Воўк.

Тут Мядзведзь ужо і лапы апусціў, але з-пад куста выскачыў вясёлы Заяц. Паглядзеў на сумнага Мядзведзя і кажа:

– Што, Касалапы, зіма надыходзіць? Разумею я цябе – без жытла замерзнеш, загінеш.

– Так, – змахнуў слязу Мядзведзь.

– Не плач, слязамі гору не дапаможаш. Хадзем да мяне, перазімуеш. Пакладу цябе ў вялікім пакоі – будзеш спаць усю зіму ды лапу смактаць.

– Цесна ў цябе, Зай, – пазіраючы вінаватымі вачыма, адказаў Мядзведзь.

– Дзе цесна – там пацешна! – падскочыў Касы. – Хадзем!

– Дзякуй, Заяц, вясёлы ты ды яшчэ добры!

– Свет не без добрых Зайцоў! – засмяяўся Касы.

## КАБ РЫБУ ЕСЦІ, ТРЭБА Ў ВАДУ ЛЕЗЦІ

Бабуля Лена жыла на ўскрайку горада ў прыватнай хаце. Быў у яе невялікі сад і агрод. Там раслі пладовыя дрэвы, бульба, буракі, памідоры, агуркі і іншая агародніна. Была ў бабулі любімая градка ўнукаў, на якой раслі клубніцы. І калі даспявалі сакавітыя, чырвоныя, духмяныя ягады, унукі Віталік і Зоська да бабулі наведваліся часцей, чым заўсёды. Перш, чым зайсці ў хату, дзеці забягалі на градку, вырывалі адну-дзве спелыя ягады і адпраўлялі сабе ў рот.

Аднойчы прыбеглі ўнукі і здзівіліся:

– Бабуля, чаму на градцы ніводнай спелай ягады няма? – спытала Зоська.Ты ўсю сабрала?

– Ды не. Учора я чула, як спелыя ягады скардзіліся, што іх ніхто не праполвае і сёння ноччу, напэўна, вырашылі ўцячы, – хітра ўсміхнулася бабуля Лена, – засталіся толькі зялёныя і чакаюць, калі сонейка іх прагрэе і дожджык вадзічкай напоіць. Але ці прагрэе сонейка скрозь зелле?

– Трэба ратаваць клубніцы, – адразу прапанавала ўнучка.

– І я так думаю, – пагадзілася бабуля.

– А я не буду, – адмовіўся Віталік, – не мужчынская гэта праца – палоць градкі.

І ён пайшоў у цянёк пад яблыню. Лёг на траву і пазіраў, як бабуля і сястра з зеллем змагаюцца.

– Ай, бабуля, як цяжка палоць, ужо сярэдзіна баліць, – праз некаторы час заныла Зоська, – і сонца так пячэ! Чаму Віталік не дапамагае?

– Пакліч яго, – сказала бабуля.

– Віталік, ідзі сюды, будзеш зелле выносіць! – крыкнула сястрычка. – Гэта ўжо мужчынская праца!

Падхапіўся брат і прыйшоў дапамагаць Зосьцы і бабулі. Ён падняў кош з зеллем і, перахіліўшыся, панёс выкідваць.

– Думаеце, лёгка выносіць гэтае зелле, – вярнуўшыся назад, паскардзіўся ён.

– Гэта ж каб есці клубніцы, столькі работы трэба перарабіць – палоць іх, паліваць, узрыхляць глебу, падкормліваць! – разважала Зоська.

– Палоць не адзін раз даводзіцца за лета, а некалькі. У жніўні трэба вусікі абрэзваць, каб расла кусцікамі, а не разрасталася па ўсёй градцы, – дадала бабуля.

– Во, сапраўды, столькі работы! – дзівіўся Віталік.

– А як вы думалі, мае ўнучкі, каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці. Каб вадзіцы напіцца, трэба ёй пакланіцца. Усё патрабуе працы і догляду. Каб мець што, трэба працаваць. А вы ж клубніцы вельмі любіце, ад кампотаў і варэння не адмаўляецеся. Так што трэба і працаваць любіць.

Нарэшце клубніцы былі прапалатыя, і бабуля падалася ў хату. Яна вынесла вялікую міску ягадаў.

– Бачыце, і клубніцы вярнуліся, каб пачаставаць вас, – падміргнула

бабуля Лена і паставіла на стол пад разложыстай яблыняй міску з духмянымі сакавітымі ягадамі.

## КОЖНАЙ СЯСТРЫЦЫ – ПА ЗАВУШНІЦЫ

Было ў бацькі пяць дочак – Арына, Аліна, Марына, Ілона і самая малодшая Алёна. Аднаго разу паспрачаліся сястрычкі паміж сабой.

– Мяне тата любіць больш за ўсіх! – з выклікам сказала Ілона.

– І адкуль ты гэта ведаеш? – насцярожана спытала Аліна.

– Таму што заўсёды купляе мне ўсё, што папрашу.

– Ну і што! – усклікнула Арына. – І мне ён усё купляе. А любіць мяне, сапраўды, больш, чым вас усіх! Таму што заўсёды мяне падтрымлівае, дае парады. Толькі з ім я магу падзяліцца сваімі сакрэтамі.

– Ну і што! І я ўсё давяраю тату. І мне ён дае добрыя парады, – абуралася Марына.

– Мяне тата любіць больш за ўсіх вас, – раўніва адазвалася маленькая Алёнка, – ён заўсёды купляе мне прысмакі і цацкі. І на руках мяне носіць!

– І нам купляе! – амаль у адзін голас усклікнулі чатыры старэйшыя сястры. – А на руках цябе носіць, таму што ты яшчэ маленькая!

Аднойчы паехаў бацька ў далёкую краіну і надоўга. Вельмі сумавалі па ім дачушкі. Не хапала бацькавых падказак, парад, суцяшальных слоў… Чакалі з нецярпеннем дзяўчынкі, калі ён вернецца.

І вось нарэшце прыехаў бацька дадому. Любыя дачушкі кінуліся да яго ў абдымкі – не маглі нарадавацца, нацешыцца. І калі хваля цёплай сустрэчы крыху адступіла, бацька сказаў:

– Мілыя дочачкі, я прывёз вам падарункі. – І ён уручыў кожнай дзяўчынцы па аднолькавай аксамітнай скрыначцы.

– Кожнай сястрыцы – па завушніцы, – цёпла ўсміхнуўся бацька.

Сястрычкі адкрылі скрыначкі і ахнулі. Ва ўсіх аказаліся аднолькавыя залатыя завушніцы, з дробненькімі вочкамі-дыяментамі, якія пераліваліся праменьчыкамі шчырай татавай любові да сваіх дачушак.

– А чаму ўсім аднолькавыя падарункі? – ад нечаканасці спытала старэйшая дачка Арына.

– Таму што ўсіх вас, дачушкі, люблю аднолькава! – з пяшчотнымі іскрынкамі ў вачах адказаў тата.

## БЕЛЫЯ РУЧКІ ЧУЖУЮ ПРАЦУ ЛЮБЯЦЬ

Алёнка прыехала да бабулі ў вёску на летнія канікулы. Дзяўчынка цэлымі днямі бавілася з сяброўкамі на рэчцы, любіла катацца на веласіпедзе ў парку, а раніцай доўга спала. Бабуля не магла дачакацца, каб унучка дапамагла ёй што-небудзь зрабіць па хатніх справах. А працы ў бабулі было даволі: і агарод прапалоць трэба, і ў хаце прыбраць і сена дапамагчы дзеду прасушыць.

– Гарадская ты ў мяне. Не любіш працаваць, – папракала Алёнку бабуля, – а дарэмна. Працу трэба любіць. Яна загартоўвае, робіць людзей моцнымі і дужымі. А ты толькі ля камп'ютара не лянуешся сядзець і каля люстэрка выкручвацца. Магла б і дапамагчы мне што-небудзь.

– Ай, потым рукі брудныя будуць, не адмыць, – адказвала дзяўчынка.

А самой шкада станавілася бабулі. Старэнькая яна, слабенькая.

Аднойчы бабуля палола на агародзе градкі. Прыбегла да яе Алёнка і пытае:

– Бабулечка, можа дапамагчы табе?

– Дык ты ж свае далікатныя ручкі выпацкаеш. Паглядзі, якія ў мяне брудныя. І твае такія будуць. У цябе вунь гладзенькія, маладзенькія, беленькія ручкі… Але найгорш, што яны чужую працу любяць, – сказала бабуля.

Унучка зірнула на зморшчаныя, вузлаватыя ад працы і старасці бабуліны рукі і зразумела, што яе рукі сапраўды любяць працу старэнькай бабулі, якая корміць яе, мые адзежу. І дзяўчынцы зрабілася сорамна. Яна прысела і пачала дапамагаць палоць.

## АБЯЦАНКА-ЦАЦАНКА, А ДУРНОМУ РАДАСЦЬ

У Вовы старэйшы брат Грыша – хакеіст. Ёе гуляе за гродзенскую хакейную каманду “Нёман”. Ганарыцца Вова братам. Не раз сам быў на трэніроўках у лядовым палацы. Аднойчы Грыша апрануў Вову ў свой хакейны касцюм з усімі “прыбамбасамі”, клюшку ў рукі ўручыў і сфатаграфаваў для гісторыі. Вова ледзь варушыўся ў касцюме – цяжка, непаваротліва. Як толькі ў ім брат гуляе, ды яшчэ на каньках?!

Хутка адбудзецца матч з мінскай хакейнай камандай “Дынама”. Грыша абяцаў узяць з сабою Воўку. Не можа дачакацца хлопец, калі ўжо паедзе ў Мінск. Сябрам сваім пахваліўся, што пабывае ў сталіцы. Зайздросцяць сябры, а Вова ганарыцца.

Надышоў час ехаць, а брат не ўзяў Воўку. Спаслаўся на лішнія клопаты з ім, малым.

– Які я малы? – абураўся Вова, – мне ўжо адзінаццаць гадоў. – Навошта тады абяцаў!

Але Грыша не ўзяў яго. Воўка ледзь не плакаў ад крыўды. А сябры? Засмяюць!

– Не крыўдуй, Воўка, – супакойваў яго Грыша, – што гэты Мінск! Вось зімой будзем гуляць з маскоўскім “Дынама”. Там будзе на што паглядзець. Гульня будзе сур'ёзная. Паедзем у Маскву. Пакажу табе расійскую сталіцу. Вось пабачыш, абяцаю!

– У Маскву?! – ледзь не падскочыў ад радасці хлопец, – я згодзен, толькі не хлусі!

– Не, Воўка, абяцаю! – сціснуў Грыша магутнымі рукамі за плечы брата.

Вова ад радасці сябрам пра Маскву расказаў.

– Так, у Мінску ты ўжо пабываў, яшчэ і ў Маскве паглядзіш гульню Грышкі, – смяюцца яны.

У прызначаны дзень пачаў збірацца Грыша ў Маскву.

– А мяне возьмеш? – заглядвае Воўка брату ў вочы.

– Разумееш, браток, тут такія справы разгарнуліся, забараняюць дзяцей з сабою браць. Нельга і ўсё! Ды табе ў школу трэба хадзіць, – адвёў вочы Грыша, – не будзе мне часу з табою вазіцца.

Воўка надзьмуўся і з-пад ілба пазіраў на брата.

– Не крыўдуй, Вова, прабач, – прасіў Грыша, – у наступным годзе плануем сыграць з нямецкай камандай. Калі што – вазьму цябе ў Германію. Табе ўжо будзе дванаццаць гадоў. Загадзя будзем рыхтавацца. Візу адкрыем.

– Не, я табе больш не веру! Ты толькі абяцаеш, а ніводнага абяцання не стрымаў.

– Затое колькі падарункаў табе прывожу. Згадзіся, ні ў кога такіх “наваротаў” няма, як у цябе. Красоўкі і майкі фірменныя носіш.

– Нашу, але колькі ты абяцанняў не здзейсніў.

– У Германію паедзеш дакладна, абяцаю, вось пабачыш! – сказаў Грыша, шчыра пазіраючы брату ў вочы.

– Не зманваеш? Вазьмеш? – павесялеў хлопец і да сэрца зноў падкралася надзея.

Цяпер Воўка жыў марай пра Германію. Ён нават сніў, як Грыша закідвае шайбу немцам у вароты. Як ён, Воўка, скача, радуецца за брата і крычыць:

– Das ist main Bruder! Das ist main Bruder!*

Не мог Воўка не падзяліцца сваёй радасцю з сябрамі. Ён весела расказваў, што паедзе ў Германію, што Грыша яму гэта цвёрда абяцаў. А калі не выканае сваё абяцанне на гэты раз, то ён яму больш не брат!

Смяюцца сябры з Воўкі і здзіўляюцца:

– Ай, не магу! Трымайце мяне! – схапіўся за жывот Коля. – “Абяцальшчык” твой Грышка. Ніколі слова свайго не стрымаў, а ты, дзівак, яму верыш і радуешся!

– Абяцанка-цацанка, а дурному радасць! – падсмяяў Гена.

– Абяцаная шапка вушэй не грэе, – дадаў Коля.

– Ёсць такія прыказкі, – аптымістычна засмяяўся Воўка і падміргнуў сябрам.

*Гэта мой брат!

## У РАЗУМНАЙ ГАЛАВЫ СТО РУК

Прыжмурыўшыся ад яркага сонца, на ганак выйшаў Янак. Ён салодка пацягнуўся пасля доўгага сну, агледзеўся па баках і заўважыў дзядулю Кастуся, які, напяваючы песеньку, ужо напоўніцу працаваў на сваёй

сталярцы. Дзед быў майстрам на ўсе рукі. Жыхары не толькі іх вёскі, але і ўсёй акругі звярталіся да яго, каб з густам зрабіў – аканіцы, рамы для вокнаў, дзверы і іншыя драўляныя вырабы. А самае галоўнае – дзед умеў з дрэва выразаць розныя ўзоры ды арнаменты. А якую сабе хату выбудаваў дзед Кастусь! Не хата, а казачны церам – аздоблены ўзорамі з дрэва і вымаляваны рознакаляровымі фарбамі. Людзі дзівяцца з яго кемлівасці і майстэрства.

– Добрай раніцы, дзядуля! – прыбег да дзеда Янка.

– Добрага дня, унучак, таму што раніцу ты ўжо праспаў! – засмяяўся дзед і працягваў наспеўваць песеньку.

– Дзед, а чаму ты заўсёды песні мармычаш? – спытаў унук.

– З добрай песняй жыць весялей і справа лепш ладзіцца, – бадзёра адказаў стары, – песня настрой уздымае, і рукі лепш слухаюцца, зразумеў?

– Зразумеў… – адказаў Янка.

– А што гэта ты зноў майструеш?

– Ой, працы ў мяне шмат! Людзі просяць і просяць дапамагчы ўпрыгожыць іхнія пабудовы living рознымі рэчамі.

– І як гэта ў цябе так спрытна атрымліваецца? Хто цябе навучыў?

– Бацька здатным столярам быў і мне перадаў сваё майстэрства. А вопыт яшчэ і з гадамі прыходзіць. Трэба і галаву кемлівую мець, і рукі працавітыя. У разумнай галавы сто рук!

– Як гэта зразумець?

– А так – якую справу галава задумала, тое рукі і зрабілі. А галава можа шмат чаго прыдумаць, тады рукам толькі і працаваць. Хочаш, і цябе навучу ўсяму, што сам умею?

– Хачу! – засвяціўся хлопчык, пазіраючы яснымі вачыма на дзеда.

– Ну, тады давай са мной за працу! – падміргнуўяму дзед Кастусь.

## ЯК НЕ СТАЛА ХЛЕБА, ДЫК І НАЖА НЕ ТРЭБА

Купіла бабуля Марыля карову Зорку. Не маладая ўжо была кароўка, але вельмі смачнае малако давала. А смятанка была тлустая, густая, яшчэ смачнейшая за малако. Масла так падабалася бабуліным унукам, што яны не толькі елі яго ў бабулі, яле і з сабою ў горад набіралі. Дзеці самі яго здабывалі – па чарзе білі ў драўлянай маслабойцы.

Палюбіла бабуля Марыля сваю Зорку. Клапацілася пра яе. Частавала кожны дзень чым-небудзь смачным: морквай, буракамі ці кавалачкам хлеба. А траву любіміца-кароўка ела самую сакавітую.

– Зорка… Зорачка мая… – ласкава гладзіла Марыля карову і лагодна ўсміхалася.

Зорка адчувала любоў і дабрыню гаспадыні, таму была паслухмянай, аддавала ўсё малако. І цяляткі ў кароўкі нараджаліся здаровыя і прыгожыя.

Доўга служыла Зорка Марылі. На смачным малацэ выраслі ўнукі. У іх з’явіліся свае клопаты, і яны не так часта сталі наведвацца да бабулі.

Аднойчы прыехала Марыліна дочка Ганна з горада ды кажа:

– Цяжка табе, мама, ужо карову трымаць. Колькі працы яна патрабуе. Колькі сена на зіму трэба назапасіць.

– Не, не цяжка мне. Як жа я буду без сваёй Зорачкі. Душою я да яе прырасла. Толькі вось маслабойку электрычную купі мне, дачушка, бо рукі баляць у драўлянай масла біць, – папрасіла маці.

– Добра, абавязкова куплю, – паабяцала Ганна.

Але зімою здарылася бяда. Захварэла пасля ацёлу кароўка. Вымя стала цвёрдым, малако прапала. Паклікала Марыля ветэрынарнага доктара, каб палячыў яе Зорачку. Абгледзеў доктар карову і кажа:

– Нічога ўжо не будзе. Старая яна ўжо, адслужыла сваё. Толькі на мяса яе можаш прадаць.

– На мяса?! Маю любую Зорачку?! Я ж яе так люблю! – загаласіла старая.

– Нічога не зробіш, – супакойваў яе доктар, – такое жыццё – у чалавека сваё, а ў жывёл сваё. Прыйшоў яе час.

Пагаравала, пасумавала Марыля і прадала карову.

Вясною прыехала да бабулі дачка і прывезла электрычную маслабойку.

– Няма ўжо кароўкі, нашай любай Зорачкі. Захварэла яна, прадалі, сумна сказала маці, выціраючы слёзы. – Як не стала хлеба, дык і нажа не трэба. Так і тут: як няма кароўкі, дык не патрэбна і маслабойка.